# ЗАКРЫЎСЯ XVI З'ЕЗД КП(б) БЕЛАРУСІ

18 чэрвеня і на ранішнім пасяджэнні 19 чэрвеня на з'ездзе праходзіла абмеркаванне кандыдатур, намечаных для тайнага галасавання ў склад членаў і кандыдатаў ЦК КП(б)Б і членаў рэвізійнай камісіі.

На вячэрнім пасяджэнні 19 чэрвеня старшыня лічотнай камісіі тав. Шусцін агаласіў вынікі тайнага галасавання. Тайным галасаваннем абрана членаў ЦК — 64, кандыдатаў у члены ЦК—21, у рэвізійную камісію — 7 чалавек.

Пасля гэтага з'езд аднагалосна прыняў рэзалюцыю па справаздачы ЦК КП(б)Б.

Слова прадастаўляецца тав. Валковічу. Ён прапануе паслаць ад імя з'езда прывітальную тэлеграму правадыру і настаўніку, любімаму Сталіну. Узрыў апладысментаў.

З кароткай заключнай прамовай перад сканчэннем работы з'езда выступіў тав. Шаранговіч.

## ПРАМОВА тав. ШАРАНГОВІЧА НА ЗАКЛЮЧНЫМ ПАСЕДЖАННІ XVI З'ЕЗДА КП(б)Б

Таварышы, наш з'езд КП(б)Б вычэрпаў павестку дня, намечаную для абмеркавання.

XVI з'езд КП(б)Б увойдзе ў гісторыю КП(б)Б, як з'езд небывалага згуртавання КП(б)Б вакол ЦК ВКП(б), вакол таварыша Сталіна.

XVI з'езд КП(б)Б увойдзе ў гісторыю КП(б)Б, як з'езд умацавання, мабілізаванасці і далейшай большэвізацыі нашых радоў, як з'езд ачысткі радоў КП(б)Б ад двурушнікаў, трацкістаў, правых, нацыяналістаў і ўсякіх іншых агентаў германскага, японскага і польскага фашызма.

XVI з'езд КП(б)Б праводзіў сваю работу так, як гэтага патрабазаў ад нас лютаўскі Пленум ЦК ВКП(б) і таварыш Сталін у сваім дакладзе і заключным слове на гэтым Пленуме. Мы, таварышы, можам без усякага самахвальства сказаць, што таварыш Сталін ускрыў усе нашы памылкі і недахопы ў пастаноўцы партыйна-палітычнай работы. Гэта адначасова паказвае і рост і ўмацаванне радоў КП(б)Б і яе актыва.

Таварышы, я думаю, што выкажу думку ўсяго з'езда і ўсёй КП(б)Б, калі скажу, што ўся КП(б)Б не толькі гатова, але і прымае ўсе меры да таго, каб разграміць да канца ворагаў. **(Бурныя апладысменты).** Выцягнуць іх з усіх нор, дзе-б яны ні хаваліся, і раздавіць іх як шалёных сабак. Ні самагубствы, ні змяінае шыпенне ўсёй фашысцкай сволачы з-за вугла не могуць пахіснуць нашы рады. Усіх гэтых гадаў мы знішчым. Няхай нашы ворагі пішуць пра нас што хочуць, паклёпнічаюць і робяць правакацыі. Мы ведаем толькі адно: што, ачышчаючы свае рады ад усёй гэтай патрэбна будзе і жыццё, за справу нашай любімай радзімы. **(Бурныя апладысменты).** Няхай уздрыгаюцца і трапечуць ворагі перад нашай сілай, згуртаванасцю і адданасцю радзіме, нашай партыі і правадыру таварышу Сталіну. **(Доўгія апладысменты).**

На нашым з'ездзе прыняты рашэнні, якія выцякаюць з пастаноў лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна. Нам прадстаіць вялікая работа, трудная і адказная. Мы гэтага не павінны і не маем права пераменшаць.

Нам прадстаіць вялікая работа па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва трацкістаў бухарынцаў, нацыянал-фашыстаў — гэтых агентаў япона-германскага і польскага фашызма. Я заклікаю ўсіх дэлегатаў з'езда, усю КП(б)Б і ўвесь беларускі народ энергічна ўзяцца за правядзенне гэтых рашэнняў у жыццё.

Я ўпэўнен, што мы яшчэ больш згуртуемся вакол нашай партыі, правядзем у жыццё ўсе рашэнні і тым самым пакажам нашай партыі, таварышу Сталіну, што мы вартыя сыны нашай радзімы, здольныя змагацца за выкананне прынятых рашэнняў, за перамогу комунізма.

Няхай жыве КП(б)Б!

Няхай жыве беларускі народ!

Няхай жыве наша магутная згуртаваная маналітная ВКП(б)!

Няхай жыве ЦК ВКП(б)!

Няхай жыве наш любімы, дарагі·

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы